І. М. КАРПУЦЬ

# РАЗВІЦЦЁ ВЕТЭРЫНАРНАЙ НАВУКІ

Развіццё ветэрынарнай навукі накіравана на вырашэнне вельмі важных праблем: ахову здароўя жывёлы, павышэнне якасці сельскагаспадарчай прадукцыі, прадухіленне забруджванняў навакольнага асяроддзя. Аднак па цэлым шэрагу напрамкаў у гэтай жыццёва важнай для чалавека сферы існуюць сур'ёзныя адставанні. Захворвальнасць жывёлы, асабліва маладняку, застаецца высокай з прычыны непаўнацэннасці кармлення, наяўнасці ў кармах рэшткаў хімікатаў, забруджвання навакольнага асяроддзя радыенуклідамі. Часам не заўсёды абгрунтаванае выкарыстанне супрацьмікробных прэпаратаў і розных стымулятараў выклікала паніжэнне імуннай рэактыўнасці ў жывёлы, і ў яе развіліся розныя формы імунапаталогіі, на фоне якіх шырокае распаўсюджанне атрымалі незаразная паталогія, інфекцыйныя і інвазійныя хваробы, што выклікаюцца ўмоўна-патагеннымі мікраарганізмамі, грыбамі і іншымі паразітамі; панізілася таксама эфектыўнасць вакцынацый супраць шматлікіх інфекцыйных захворванняў.

Гэтыя цяжкасці ўзмацняюцца і тым, што з-за пралікаў былых дзяржаўных органаў рэспублікі ў нас адсутнічае свая ветэрынарная, фармацэўтычная і біялагічная прамысловасць. Пасля распаду СССР і разрыву сувязей з былымі сацыялістычнымі краінамі і іншымі дзяржавамі забеспячэнне лекавымі прэпаратамі, дэзінфіцыруючымі сродкамі, інструментамі і іншымі матэрыяламі зрабілася вельмі нізкім. Для вырашэння гэтых задач патрэбна ўмацаванне навукова-даследчай базы, выдзяленне сродкаў для стварэння новых лекавых прэпаратаў, абсталявання, інструментаў і падрыхтоўкі маладых навуковых кадраў па новых напрамках навукі.

Пры ўмове забеспячэння неабходнага фінансавання вучонымі Віцебскага ветэрынарнага інстытута па выніках ужо праведзеных фундаментальных даследаванняў у найбліжэйшыя гады будзе прапанавана 15 новых прэпаратаў з мясцовай сыравіны для дыягнастычных, лячэбных і прафілактычных мэт, кансервавання кармоў і тэхналогіі на іх прыгатаванне ў Беларусі. Частка даследаванняў па стварэнні новых прэпаратаў для лекавых і прафілактычных мэт будзе выканана сумесна з супрацоўнікамі БелНДІЭВ і інстытутамі АН Беларусі. Апрача фінансавання мэтавых праграм, Акадэміі аграрных навук неабходна знайсці сродкі для забеспячэння пошукавых, тэарэтычных і фундаментальных даследаванняў. Толькі развіваючы ўсе віды навуковых даследаванняў, можна падрыхтаваць маладую навуковую змену, далучыць студэнтаў да навуковых даследаванняў, павысіць навуковую кваліфікацыю выкладчыкаў ВНУ і супрацоўнікаў НДІ, распрацаваць новыя навуковыя напрамкі і ўкараніць навуковыя распрацоўкі ў вытворчасць.

Для паспяховага развіцця прыярытэтных навуковых напрамкаў і забеспячэння НДІ і ВНУ навуковымі і навукова-педагагічнымі кадрамі неабходна дакладна спланаваць падрыхтоўку маладых вучоных праз аспірантуру і дактарантуру. Дзеля гэтага патрэбна цесная інтэграцыя НДІ і ВНУ па пошуку і адбору найбольш падрыхтаванай таленавітай моладзі сярод студэнтаў, спецыялістаў гаспадарак, арганізацый і ўстаноў, якія праявілі здольнасць да навуковай дзейнасці. Немалаважнае

значэнне ў развіцці аграрнай навукі і падрыхтоўцы навуковых кадраў мае і міжнароднае супрацоўніцтва.

Калектыў вучоных Віцебскага ветэрынарнага інстытута спадзяецца, што нанава створаная Акадэмія аграрных навук Беларусі здолее вывесці аграрную навуку рэспублікі на перадавыя пазіцыі і за кошт удасканальвання інтэграцыі навукі з вытворчасцю забяспечыць інтэнсіўныя формы развіцця аграпрамысловага комплексу.